

ПЕРАСЕКЧЫ МЕЖЫ ПАНДЭМІІ

ЯК ЗНАЙСЦІ РАБОТУ ХУТКА 15



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЖНІЎНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 164 (29278)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РАЎКОЎ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі:**

*«Не перастаю дзівіцца той сладастраснасці, з якой некаторыя «нязгодныя і пратэстоўцы» захапляюцца ў Telegram-каналах з нагоды махання сцяжкамі ў Літве, Польшчы, нават ЗША, Канадзе ў падтрымку пратэстаў у Беларусі. Прычым любому чалавеку, спадзяюся, ясна, што гэта не паказчык — бо тыя, хто махае, нават калі яны беларусы, ужо даўным-даўно тут не жывуць, нічога не зрабілі для сённяшняй краіны, а ўвесь іх настальгічны «патрыятызм» раптам успыхвае, калі папросяць. У сувязі з гэтым пытанне да тых, хто так замілаваны замежнымі падскокваннямі: вы чаму там не жывяце, вызваліўшы тут кожны сваё рабочае месца, месца вашых дзяцей у садку, паменшыўшы нагрузку на настаўнікаў у школе, конкурс у ВНУ і чаргу да ўрача? Зараз на мяне закрычаць: «Гэта наша зямля, родная і непаўторная, мы нікуды не павінны ехаць!» І гэта правільна, наша. Тады і абапірайцеся на яе, а не на імпартныя эмоцыі».*

# Да навучальнага года гатовыя!



Вучні 3 «Б» класа Мацвей МАХАМАД, Сафія і Паліна АСОС, Яна ЧАЎНАВАЯ разам з класным кіраўніком Таццянай Віктараўнай АСОС.



У новым навучальным годзе ў сталічныя школы пойдзе крыху больш за 217 тысяч школьнікаў. Усе ўстановы адукацыі сталіцы атрымалі пашпарты гатоўнасці. За канікулы змяніліся фасады будынкаў, навучальныя кабінеты і спартыўныя залы. Прыме юных мінчан і новая школа № 52 у мікраараёне Каменная Горка.

**Ганна ЗАНКАВІЧ. Фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Усталяваны новы сусветны рэкорд хуткасці інтэрнэту — 10 Гб / сек. Пакуль такая хуткасць даступная толькі некаторым жыхарам Японіі, ЗША і Новай Зеландыі.**
- Беларусь і Расія падпісалі кантракты на пастаўку БТР-82А і верталётаў Мі-35М.
- **Грамадзяне Украіны з 1 верасня будуць прыязджаць у Беларусь толькі па замежным пашпарце.**

ISSN 1990 - 763X

Экатэхналогіі

## БЕЗ ПЛАСТЫКУ

### Якія захады робяцца ў краіне, каб зменшыць выкарыстанне палімернай упакоўкі



**У студзені 2020 года быў зацверджаны План мерапрыемстваў па паэтапным зніжэнні выкарыстання палімернай упакоўкі з яе замяшчэннем на экалагічна бяспечную. Што для рэалізацыі гэтага плана прапануюць дзяржорганы, навукоўцы і прамыслоўцы?**

### Увесь свет супраць

Перш за ўсё разбяромся, што такое біяраскладальная ўпакоўка. Па словах **дырэктара Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі, кандыдата эканамічных навук Валерыя ГАНЧАРОВА,** у замежных стандартах прапісаны асноўныя патрабаванні да такой упакоўкі: пры пэўных умовах асяроддзя (тэмпературы, вільготнасці, газавым рэжыме) яна павінна раскласціся за 90 дзён.

— Любая ўпакоўка, пластыкавая ці біяраскладальная, патрабуе стварэння сістэмы збору, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА.** — Міжнародная практыка сведчыць пра тое, што біяраскладальная ўпакоўка часцей за ўсё накіроўваецца на кампасціраванне. У Беларусі развіваецца сістэма кампаставання раслінных адходаў, арганічнага складніка камунальных адходаў. Такім жа чынам можна выкарыстоўваць і адходы біяраскладальнай упакоўкі.

СТАР. 14

Жыллё

## ШЧАСЛІВАГА ПЛАВАННЯ, «КАРАБЛІ»!

**Сёння вядзецца актыўная распрацоўка праграмы жыллёвага будаўніцтва галоўнага горада краіны на 5 і 10 гадоў.**

Новы пакет дакументаў дастаткова канкрэтна вызначыць пляцоўкі для будаўніцтва шматкватэрнага жылля. Таксама ў ім будзе канчаткова вырашана пытанне з тэрыторыямі, на якіх плануецца знос існуючай сядзібнай або малапавярховай забудовы. Мяркуецца, што праграма будзе цалкам сфарміравана на працягу найбліжэйшага месяца.

### ПЕРСПЕКТЫВА ДЛЯ ПРЫВАТНІКАЎ

**Першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Дзмітрый МІКУЛЁНАК** адзначае, што пры звароце жыхароў да ўлад горада пытанні ў асноўным датычацца зносу прыватнага сектара: ці будзе ён і калі. Многія ўласнікі такой маёмасці жывуць у напружанні ўжо працяглы час, не ведаючы дакладных перспектыў. Таму патрэбна выразная стратэгія на наступнае дзесяцігоддзе, згодна з якой будзе дакладна вызначана, што пойдзе пад знос, а што не. З іншага боку, гаспадарам дамоў, якія будуць захаваны на гэты перыяд, дадуць дазвол займацца рэканструкцыяй свайго жылля.

Мясцовыя органы ўлады падзяліліся і найбліжэйшымі планамі. Так, на працягу некалькіх наступных гадоў жыллёвае будаўніцтва будзе сканцэнтравана ў Смалявічах, Сокале, Чыжоўцы, у раёне вуліцы Ангарскай, на тэрыторыі былой вёскі Сухарава.

СТАР. 15

З першых вуснаў

# «Нам трэба вельмі актыўна пачынаць навучальны год, чаго б гэта ні каштавала»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра адукацыі Ігара Карпенку, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Па словах Прэзідэнта, вучыцца трэба ў любыя часы і «трэба вельмі актыўна пачынаць навучальны год, чаго б гэта ні каштавала».

«Калі ў нас атрымаецца скомканы і пачатак навучальнага года, гэта зусім дрэнна. Вы помніце, як мы заканчвалі навучальны год у сувязі з каранавірусам і тымі насцярожанасцямі, якія былі ў грамадстве, асабліва ў бацькоў. Празмернымі насцярожанасцямі, як мы цяпер разумеем», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Як перадае прэс-служба Прэзідэнта, ён адзначыў: запрасіў на даклад міністра Ігара Карпенку і віцэ-прэм'ера Ігара Петрышэнку, каб даведацца аб праблемах, якія неабходна вырашыць напярэдадні навучальнага года.

«Вельмі вас прашу, паглядзіце, каб дзеткі ў школу пайшлі ў нейкім вонкава роўным статусе. Не павінны адрозніваца дзеці з сем'яў багатых ад дзяцей з сем'яў бяднейшых. Трэба дапамагчы там, дзе трэба дапамагчы. Асабліва бедным сем'ям, шматдзетным. Хоць уже не ведаю, як шматдзетным дапамагаць: такі пакет у нас з боку дзяржавы сацыяльны, якога не мае ні адна дзяржава», — дадаў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу, што падключыліся да аказання дапамогі ў падрыхтоўцы дзяцей да школы многія суб'екты гаспадарання — ад сельгаспрадпрыемстваў да буйных прамыслоўцаў. «Хто заплечнік збярэ, хтосьці дзеткам форму купіць школьную, хтосьці грошай падкіне. Па-рознаму бывае, але ўсе далучыліся да гэтага, нягледзячы на тое што некалькі тысяч у нас блукаюць па вуліцах і спрабуюць паверхнуць сітуацыю ў свой бок», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт запатрабаваў абараніць настаўнікаў у школах ад усялякіх нападак.

«Мы гэта ўжо пачалі рабіць, прытым робім вельмі актыўна і вельмі жорстка перарываем усякія наезды, накаты на настаўнікаў, урачоў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён дадаў, што і адукацыя, і школы, і ідэалогія ў нас дзяржаўныя, і тых, хто хоча ісці з гэтымі прынцыпамі, чакаюць сяроднім выкладчыкаў.

«Калі ласка, ідзіце выкладаць, вучыце, працуйце. Тыя, хто не хоча, значыць, яны ў школе быць не павінны. Гэта трэба казаць прама, адкрыта і сумленна, — заявіў Аляксандр Лукашэнка і падкрэсліў: — Калі хтосьці перакінуўся ў іншы лагер, нам таксама трэба з імі разбірацца».

Ігар Карпенка далажыў: па стане на пятніцу мінулага тыдня 96 % школ у краіне атрымалі сертыфікаты гатоўнасці і нейкіх сур'ёзных праблем з падрыхтоўкай няма.

# «Хацелася б ужо калі не расстацца з гэтай хваробай, то звесці яе да абсалютнага мінімуму»

**Першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый Піневіч будзе выконваць абавязкі кіраўніка гэтага ведамства. Адпаведнае рашэнне прыняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Кандыдатуру ўнесла старшыня Савета Рэспублікі і ўпаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску Наталля Качанава, таму на яе ўскладзена адказнасць за дзейнасць ведамства.

«Ну а далейшы, Дзмітрый Леанідавіч, ваш лёс будзе залежаць ад вас. Крыху — ад Наталлі Іванаўны (Качанавай. — **«Зв.»**), паколькі яна нікуды не сыходзіць, яна будзе працаваць і падтрымліваць, дапамагаць вам, калі гэта трэба будзе», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на нядрэнную работу медыкаў у барацьбе з каранавірусам, асабліва ў другім перыядзе гэтай хваробы.

«Можа быць, спачатку не зусім мы былі актыўныя, не зусім разумелі штосьці. Але вельмі хутка разабраліся, рассартавалі людзей, вылучылі клінікі для хворых каранавірусам, запас ложкаў стварылі, апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх, навучылі людзей лячыць і дапамагалі рэгіёнам. Гэта вялікі плюс у вашай біяграфіі, гэта вельмі вялікі актыў», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што хвароба поўнасцю не сышла, але пакуль не было і другой хвалі, як у Еўропе. «Але павінен сказаць, што вось гэтыя нашы цёркі на вуліцах, яны даюць аб сабе знаць, і ў нас няма таго спаду, як гэта было калісьці, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Дай бог, каб было так, як сённяшні ўзровень. Але хацелася б ужо калі не расстацца з гэтай хваробай, то звесці яе да абсалютнага мінімуму. Пакуль мы спыніліся на нізкім узроўні захворвання. І зусім нізка не падаем».

Пры гэтым кіраўнік краіны запэўніў, што мы з хваробай справімся, бо гэта ўжо не тая праблема, якая была ў сакавіку, красавіку.

Ён звярнуў увагу на тое, што, акрамя каранавіруса, нельга забываць і пра іншыя хваробы. «І сардэчнасасудзістыя, і анкалогія, і астма нікуды не сышлі, і многія іншыя захворванні. Трэба пра гэта не забываць. А то людзі крыўдзяцца, як быццам у нас сёння толькі каранавірус. Каранавірус у агульнай масе не лідзіруе, ёсць іншыя хваробы. Таму я з усёй адказнасцю прашу звярнуць на гэта ўвагу», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сірыя засталася без электрычнасці пасля выбуху на электрастанцыі



З-за падрыву газаправода пад Дамаскам уся тэрыторыя Сірыі засталася без электрычнасці. Пра гэта паведаміла інфармацыйнае агенцтва SANA са спасылкай на Міністэрства энергетыкі Сірыі. Выбух адбыўся на ўчастку газаправода паміж раёнамі Адра і Думейр, што прывяло да агульнага адключэння электрычнасці ў краіне. Інцыдэнт вывеў са строю тры электрастанцыі. Міністр нафты і мінеральных рэсурсаў Сірыі Алі Ганім назваў выбух на газаправодзе тэрактам. Ганім таксама дадаў, што спецыялістам удалося ліквідаваць непаладкі на ўсіх электрастанцыях краіны, кожная з іх гатовая да работы. Міністр энергетыкі Мухамад Зухаір Харбутлі паведаміў, што электразабеспячэнне было аператыўна аднаўлена на шэрагу жыццёва важных аб'ектаў у Дамаску, такіх як бальніцы і жылыя кварталы. Па словах сірыйскага міністра энергетыкі, гэта шосты выбух падобнага кшталту.

### У ЗША мяркуюць выдаткаваць мільярды долараў на галасаванне па пошце

Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША ўхваліла дадатковае фінансаванне паштовай службы краіны ў памеры 25 мільярдаў долараў. Пра гэта паведаміў ТАСС. Выдзеленыя грошы пойдуць, у прыватнасці, на павышэнне ўзроўню апрацоўкі адпраўленняў дзеля галасавання па пошце на маючых адбыцца ў лістападзе выбарах прэзідэнта. Законапраект адмяняе раней уведзеныя меры па скарачэнні выдаткаў у паштовых аддзяленнях. Аднак у Белым доме папярэдзілі, што прэзідэнт ЗША Дональд Трамп накладзе вета на законапраект, калі той трапіць яму на стол. У паштовай службе папярэдзілі ўлады амерыканскіх штатаў пра імавернасць затрымак у працэсе галасавання. Амерыканскі лідар выступае супраць галасавання па пошце. На яго думку, у гэтым выпадку прэзідэнцкія выбары будуць уразлівыя для ўмяшання з-за мяжы. Трамп дапусціў, што іншыя краіны могуць перахапіць выбарчыя бюлетэні ці надрукаваць падробкі. Ён сцвярджае, што з-за магчымых парушэнняў пры такім спосабе хуткія выбары ў лістападзе могуць стаць самымі несумленнымі ў гісторыі. Пры гэтым пазней з'явілася інфармацыя пра тое, што Трамп і яго жонка Меланія прагаласуюць на праймерыз па пошце.




### На Філіпінах здзейснены двайны тэракт

Не менш за дзевяць чалавек загінулі, дзясяткі пацярпелі ў выніку падвойнага тэракта ў горадзе Хола на Філіпінах. Пра гэта паведаміў кіраўнік Чырвонага Крыжа краіны Рычард Гордан. Паводле яго слоў, спачатку побач з ваенным грузавіком выбухнуў матацыкл з замацаваным на ім саматробным прыстасаваннем. Затым, калі на месца здарэння прыбыла паліцыя, адбыўся другі выбух. Сярод загінулых — пяцёра салдат і чацвёра грамадзянскіх асоб. Каля 20 ваенных пацярпелі. Як вядома, у правінцыі Сулу дзейнічае радыкальная групоўка «Абу Саяф», з 2014 года звязаная з «Ісламскай дзяржавай».

# Беларусь стане першай

**Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна адбылася ўчора днём. Пра гэта паведаміла БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара.**

Прэзідэнты абмеркавалі сітуацыю ўнутры нашай краіны і на знешнім контуры, асабліва на заходнім напрамку.

Акрамя таго, кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі пытанні барацьбы з каранавірусам. У гэтым ключы прэзідэнты дамовіліся, што грамадзяне Беларусі ў добраахвотным парадку прымуць удзел у трэцім этапе выпрабаванняў вакцыны ад каранавіруса, якая выраблена ў Расійскай Федэрацыі. Таксама Беларусь стане першай краінай, куды будзе пастаўлена гэтая вакцына.

Увага, конкурс!

# Журналістаў і блогераў запрашаюць паўдзельнічаць

**Аб'яўлена правядзенне адкрытага конкурсу «#Дзень_беларускага_пісьменства2020».**

Як паведамляецца на сайце Магілёўскага аблвыканкама, арганізатарамі конкурсу выступаюць абласная арганізацыя Беларускага саюза журналістаў, галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама, а таксама рэдакцыя Бялыніцкай раённай газеты "Зара над Друццю". Конкурс праводзіцца да 1 верасня 2020-га.

Хто можа паўдзельнічаць? Журналісты і блогеры, якія выказалі жаданне апублікаваць артыкул у друкаваным СМІ, падрыхтаваць тэле- або радыёрэпартаж, скласці і апублікаваць пост (інфармацыйны блок, размешчаны карыстальнікам у сацыяльнай сетцы, блогу) па тэматыцы конкурсу.

Спаборніцтва праводзіцца па наступных намінацыях:

I — найлепшы аўтар публікацый у друкаваных СМІ;

II — найлепшы рэпартаж у электронных СМІ;

III — найлепшы блогер.

У кожнай з трох груп прысуджаецца 1-е, 2-е і 3-е месца. За першае месца ў кожнай намінацыі пераможцам уручаецца дыплом і прэмія ў памеры 5 базавых велічынь, за другое і трэцяе — дыплом і спецыяльны падарунак.

Конкурсныя матэрыялы, размешчаныя ў сацыяльных сетках, павінны абавязкова быць пазначаны хэштэгам «#Дзень_беларускага_пісьменства2020».

Заяўку на ўдзел у конкурсе і конкурсныя матэрыялы неабходна накіроўваць на электронны адрас otd.smi@yandex.ru з абавязковай пазнакай «На конкурс». Прымаюцца інфармацыйныя матэрыялы, публікацыі, радыё- і тэлерэпартажы 2019—2020 гадоў, прысвечаныя падрыхтоўцы і правядзенню Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах, папулярызацыі беларускага пісьменства і літаратуры.

Узнагароджанне пераможцаў конкурсу адбудзецца ў Бялынічах на мерапрыемствах Дня беларускага пісьменства.

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 412/С-24197 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – заготовительный ларек), площадью 49,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37А.
Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый номер 424050100006000382 (назначение – для обслуживания здания заготовительного ларька), площадью 0,0221 га, расположенном по адресу: г. Мосты, ул. Кирова, 37/2

Начальная цена продажи – 2 400 руб. (две тысячи четыреста рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 240 руб. (двести сорок рублей)

**Продавец – Гроднооблпотребобщество (Мостовский филиал), 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70, 55-87-70**

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 25 сентября 2020 г. в 14.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.03.2020 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

**Последний день приема заявлений – 23 сентября 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні кансультанту аддзела дзяржаўнай экалагічнай экспертызы ўпраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змяненне клімату і экспертызы Бялевіч Аксане Леанідаўне ў сувязі з напаткаўшай яе сям'ю непапраўнай стратай — смерцю любімага МУЖА і БАЦЬКІ.**

# «БЕЛАРУСЬ НА ЗНЯВАГУ НІКОМУ НЕ АДДАДЗІМ»

## У суботу ў Гродне адбыўся мітынг з удзелам Аляксандра Лукашэнкі

**Гродна стаў першым рэгіянальным горадам, дзе Прэзідэнт выступіў перад удзельнікамі мітынгу. Для многіх гродзенцаў, якія прыйшлі на цэнтральную плошчу, прыезд кіраўніка дзяржавы стаў нечаканасцю. Прэзідэнт выступіў з прамовай, у якой акрэсліў злабадзённыя пытанні і выказаў спадзяванне, што будзе пачуты.**

Напачатку ён прыгадаў, што шмат гадоў таму сваю першую перадвыбарчую кампанію пачынаў менавіта з гэтага прыгожага рэгіёна. І большасць галасоў у падтрымку была менавіта адсюль. І зараз новая сітуацыя, па словах Прэзідэнта, не зусім зразумелая.

«Калі я падыходзіў да плошчы, мне многія казалі, што ў Гродне нейкая сітуацыя не тая. Я кажу: «Няпраўда. Не можа быць, каб там так перакруціліся людзі». І ўбачыўшы гэты вялізны шматтысячны натоўп людзей, я зразумеў, што гродзенская зямля — гэта наша зямля». Пасля гэтых слоў людзі на плошчы пачалі апладзіраваць і скандзіраваць: «Беларусь!», «Беларусь!»

Прэзідэнт заклікаў гродзенцаў нікому і ніколі не аддаваць сваю краіну, трымаць сваю зямлю, не дапускаць знешняга ўмяшальніцтва ў справы сваёй краіны. «Сёння нас штурхаюць у прорву разладу і нянавісці. На заходняй мяжы неспакойна, бразгаюць зброяй, пагражаюць, адкрыта ўмешваюцца ва ўнутраныя справы нашай суверэннай дзяржавы. Хтосьці нават, пацiраючы рукі (я гэта ведаю дакладна) успамінае пра «ўсходнія крэсы», дзе ўсё беларускае было пад забаронай. Зараз гэта наша зямля. Зямля суверэннай Беларусі, дзе жывуць у міры і згодзе ўсе нацыянальнасці, якія фарміруюць каркас беларускага народа. А сваю зямлю мы павінны абараняць. Сёння хапае тых, хто хацеў бы адхапіць хоць кавалак гэтай зямлі, асабліва гэтай заходняй жамчужыны Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў асаблівую ўвагу тэме мяжы. Перад мітынгам ён пабываў на Гожскім палігоне, які знаходзіцца непадалёк ад мяжы з Еўрасаюзам. Між тым на заходніх рубяжах, як нідзе, трэба захоўваць пільнасць, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

«Праз мяжу едуць розныя людзі. У свой час мы прынялі рашэнне па бязвізавым праездзе ў Гродзенскі рэгіён. Любы замежнік можа без фармальнасці, без праверак прыехаць сюды і пабачыць прыгажосць нашай краіны і ўкласці пры жаданні сродкі ў вобласць. І што мы бачым? Прыехалі, махаюць сцягамі, бузяць, вас падбухторваюць на беспарадкі. Ядро, завадатары — не гродзенцы, не беларусы. Яны сядзяць пад Варшавай, пад Вільнюсам... Тыя, хто ўсё каардынуе і кіруе гэтым, сядзяць за мяжой у суседніх краінах».

Разам з тым Прэзідэнт зазначыў, што ён, як былы пагранічнік, хоча папярэдзіць і нагадаць, што гэта не толькі беларуская, але і мяжа Саюзнай дзяржавы. Таму кіраўніцтва дзяржавы і кіраўніцтва членаў АДКБ занялі цвёрдую пазіцыю, многія краіны таксама яе падтрымліваюць. Прэзідэнт выразна акрэсліў сутнасць унутранай палітыкі — Беларусь на зняваґу нікому не аддадзім.

Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне Заходняму аператыўнаму камандаванню ўзяць на самы жорсткі кантроль перамяшчэнне ўсіх ваенных падраздзяленняў краін-суседзяў — удзельніц НАТА. Дзяржаўнаму пагранічнаму камітэту — узмацніць ахову па ўсім перыметры дзяржаўнай мяжы.

Літаральна «перабіраць» кожнага, хто рухаецца з неправамоцнымі мэтамі. Ні адзін бавік, ні адзін правакатар, і ні адзін патрон не павінны трапіць на тэрыторыю краіны, папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. У выступе прагучала і тэма каранавіруса. Было агучана, што на лячэнне ковідных хворых у краіне было выдаткавана 500 мільёнаў долараў ЗША. Прэзідэнт зазначыў, што курс на ізаляцыю аказаўся неэфектыўным, аб чым заявіў і кіраўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Між тым пагроза захварэльнасці застаецца, і за гэтай сітуацыяй неабходна пастаянна сачыць.

Далей Прэзідэнт спыніўся на тэме забастовак. Вядома, у кожнага свой настрой. І гэта добра. Але ёсць такія, што не хочуць працаваць і падбіваюць на забастоўкі будаўнікоў. А між тым у горадзе будуецца шэраг знакавых аб'ектаў: важны для рэгіёна анкалаічны цэнтр, сучасныя студэнцкія інтэрнаты, дзе будуць пражываць тысячы іншагародніх студэнтаў, уводзіцца АЭС — аб'ект стратэгічнага значэння.

«Вы сёння спынілі будаўніцтва. Мы абыдземся без «Гроднажылбуда». У нас дастаткова будаўнікоў. Калі хтосьці не хоча працаваць, не трэба іх прымушаць. Прадпрыемства спынім, людзі астынуць, разбяромся, каго потым запрасіць на гэтае прадпрыемства».

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да сваю тароў. Беларускі лідар заклікаў прадстаўнікоў розных канфесій не ўмешвацца ў пытанні палітыкі.

Прэзідэнт паабяцаў вярнуць беларусам спакойнае жыццё, да якога яны прывыклі ў ціхай, талерантнай краіне. А сілавым структурам даручана выявіць усіх падбухторшчыкаў і правакатараў, спісы якіх, запэўніў Прэзідэнт, ужо ёсць. Ён таксама запэўніў, што ўсе спробы ціску на работнікаў розных сфер з боку праціўнікаў улады будуць жорстка спыняцца.

Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што вакол сітуацыі ў краіне ствараецца шмат фэйкаў. Прыгадаў выпадак з пяцігадовай дзяўчынкай, якая пацярпела падчас масавых беспарадкаў у Гродне. «Нядаўна паказалі гродзенскую дзяўчынку, якую быццам бы збіў АМАП. І ўся краіна рыдала пяць дзён — якія нягоднікі амапаўцы. А што адбылося на самай справе? Добра, дзякуй таму бацьку, які знайшоў мужнасць і сумлення сказаў: ды госпадзь з вамі, ніякі АМАП не збіваў, мы трапілі ў ДТЗ. Дзякуй яму вялікі, гэта мужны чалавек. І такія фэйкі ўвесь час запаўняюць наш эфір. 60 % паказвалі сінякі, 60 % — пастановачныя кадры. Пройдзе час, і мы вам спакойна аб гэтым скажам і пакажам». Кіраўнік дзяржавы заклікаў трымаць галаву на плячах, аналізаваць і параўноўваць інфармацыю з розных крыніц, каб мець магчымасць сфарміраваць сваё ўласнае меркаванне аб сучасных падзеях. «Не будзеце думаць, нас усіх не пад бізун паставяць — па калена загоняць у чужую зямлю. Мы ўсе — адна краіна. Гэта наша краіна — чыстая, мірная, наша Беларусь. Якую мы абавязаны захаваць і перадаць нашым дзецям і ўнукам».

Пры развітанні з жыхарамі Гродзеншчыны, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што пакідае Гродна надзвычай натхнёны і ўзрушаны. За гэта ён падзякаваў усім удзельнікам мітынгу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Прызначэнні

# «ЁН ВАШ. МАЛАДЫ, РАЗУМНЫ»

## У Гродзенскай вобласці — новы кіраўнік. Старшыню аблвыканкама Уладзіміра Караніка, які ўзначальваў сістэму аховы здароўя Беларусі, прызначылі ў суботу, 22 жніўня

**Такое рашэнне прыняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і прапанаваў яго кандыдатуру падчас сустрэчы ў Гродне з дэпутатамі абласнога Савета дэпутатаў. Пазней кіраўнік краіны прадставіў новага губернатара на мітынгу, які адбыўся на цэнтральнай плошчы горада — плошчы Леніна.**

«Мною прынята рашэнне аб накіраванні да вас вашага чалавека — Уладзіміра Сцяпанавіча Караніка, — растлумачыў сваё рашэнне кіраўнік дзяржавы дэпутатам абласнога Савета, паведамляе БелТА. — Для мяне гэта вялікая страта. Таму што гэта геройскі чалавек падчас каранавіруса. Калі б не ён, нам было б вельмі цяжка. Гэта быў першы памочнік Прэзідэнта па ўсіх пытаннях, першы генерал, які выконваў мае ўказанні. І мы правільна зрабілі».

«Ён ваш. Малады, разумны», — адрэкамендаваў Прэзідэнт новага губернатара. Трэба сказаць, што з гэтай прапановай народныя абраннікі пагадзіліся аднагалосна.

На сустрэчы былі адзначаны і вялікія заслугі, шматгадовая плённая праца на пасадзе губернатара Уладзіміра Краўцова. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што да ўжо былога губернатара ў яго няма ніякіх прэтэнзій.

Уладзімір Каранік у сваю чаргу падзякаваў за падтрымку. «Я выдатна сабе ўсведамляю тую адказнасць, якая кладзецца на мае плечы. Ні для кога не сакрэт — гэта мая малая радзіма, дзе я нарадзіўся і вырас, — адзначыў ён. — Думаю, калі пена пройдзе і ўсе прыйдуць у спакойны стан, то зразумеюць, што гэта наша зямля, і асноўнае — што мы можам дасягнуць у жыцці, зрабіць сваімі рукамі і мазгамі. Ніхто іншы нам не дапаможа. Патэнцыял вобласці велізарны».

Пасля сустрэчы з дэпутатамі абласнога Савета Аляксандр Лукашэнка накіраваўся на мітынг, які праходзіў побач на плошчы Леніна. Там ён публічна яшчэ раз прадставіў новага губернатара. «Уладзімір Сцяпанавіч, вы першы за чвэрць стагоддзя губернатар, якога прынялі на плошчы. Ад вас многае залежыць. Вы павінны дапамагчы гродзенцам. Галоўны наш клопат — людзі», — падкрэсліў Прэзідэнт.



Фота БелТА.

**• Наша даведка**

Уладзімір Сцяпанавіч Каранік нарадзіўся ў 1973 годзе ў Гродне. У 1996 годзе скончыў Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут.

З 1996 да 2011 года працаваў на розных пасадах у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава (раней — Навукова-даследчы інстытут анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава). З'яўляўся ўрачом-стажорам, малодшым навуковым супрацоўнікам, навуковым супрацоўнікам аддзялення таракальнай анкапаталогіі, таракальнай хірургіі (загадчыкам) РНПЦ. З 2011 года займаў пасаду галоўнага ўрача Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера, у чэрвені 2019 года прызначаны міністрам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

**• У тэму**

### «Сучасны кіраўнік: шматгранны, кампетэнтны, дасведчаны»

**Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, які быў абраны членам Савета Рэспублікі ад Гродзенскай вобласці, падзяліўся са «Звяздой» сваім меркаваннем аб гэтым кадравым прызначэнні:**

— Узнікаюць новыя выклікі часу і новыя задачы, якія ў гэты няпросты час патрабуюць далейшага дынамічнага развіцця рэгіёна. Упэўнены, што Уладзімір Каранік годна справіцца з гэтай задачай, бо ў барацьбе з распаўсюджаннем каранавіруснай інфекцыі як міністр аховы здароўя праявіў сябе з найлепшага боку — дзякуючы яго намаганням удалося захаваць тысячы чалавечых жыццяў.

За перыяд, падчас якога ён узначальваў профільнае міністэрства, былі закладзены істотныя змены ў праект закона «Аб ахове здароўя». Акцэнты зроблены на развіццё апорных бальніц, фармацэўтычную галіну і інфарматызацыю ўсёй сістэмы. Усе гэтыя захады дадуць адчувальныя вынікі і наблізяць якасную медыцынскую дапамогу нават да жыхароў вясковай глыбінкі.

Упэўнены, што прызначэнне Уладзіміра Караніка на пасаду кіраўніка Прынёманскага рэгіёна надасць новы імпульс развіццю гэтай тэрыторыі, бо гэта сучасны кіраўнік — шматгранны, кампетэнтны і дасведчаны па многіх кірунках дзейнасці: ад сацыяльнай сферы да міжнароднай дзейнасці.

### Уладзімір КАРАНІК: «У вобласці вельмі вялікі патэнцыял, і яго трэба развіваць далей»

**«Звязда» адной з першых пацікавілася планамі новага кіраўніка рэгіёна адразу пасля таго, як ён быў прадстаўлены жыхарам вобласці на плошчы:**

***— Уладзімір Сцяпанавіч, ці стала для вас гэтае прызначэнне нечаканасцю або сюрпрызам, таму што толькі днямі быў зацверджаны новы склад урада, і вы на пасадзе міністра аховы здароўя?***

— Мы не павінны ўспрымаць гэта як сюрпрыз — гэта новае прызначэнне і новы ўчастак работы, і новыя задачы, якія трэба вырашыць. Чакаемае ці не — гэта іншае пытанне, але гэта не сюрпрыз, а новае прызначэнне, новы кірунак і новыя задачы.

***— Кажучы аб задачах, якія прыярытэты вы перш за ўсё ставіце перад сабой?***

— Адной з цэнтральных задач з'яўляецца рэалізацыя напрамкаў дзяржавы дзеля дасягнення камфортнага і годнага жыцця для жыхароў Гродзенскай вобласці. Сярод прыярытэтаў — захаванне дынамічнасці развіцця Прынёманскага рэгіёна. Гэта агульныя словы, але па-іншаму нельга коратка сфармуляваць тую разнастайнасць задач і праблем, якія стаяць перад рэгіёнам.

***— Яны ўжо вам вядомыя?***

— Безумоўна, я родам адсюль. У мяне тут засталося шмат сяброў, я часта сюды прыязджаю, я бачыў, што вобласць, сапраўды, вельмі дынамічна развіваецца, у яе на самай справе вельмі вялікі патэнцыял. І асноўнае — гэта людзі, якія заўсёды былі памяркоўныя і працавітыя. І зараз стаіць задача — развіваць гэты патэнцыял далей.

***— Адыходзячы ад сённяшняга прызначэння, хочацца пацікавіцца яшчэ як у міністра аховы здароўя: якая сітуацыя на сённяшні дзень складваецца з каранавірусам у Гродзенскай вобласці?***

— Сітуацыя абсалютна кантралюемая, і мы ўздымаў пакуль не бачым.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 4 (50)




*29 жніўня 1960 года быў створаны Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па ахове прыроды. Сёння гэта Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.*


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Дарагія калегі, сябры! Ад усёй душы віншую вас з днём заснавання сістэмы аховы навакольнага асяроддзя ў Беларусі!**

З 1960 года ў нашай краіне дзейнічае сістэма, галоўнымі задачамі якой з'яўляюцца ахова прыроды і рацыянальнае выкарыстанне яе рэсурсаў. Мы прайшлі вялікі шлях, каб навучыцца трымаць баланс паміж дзейнасцю чалавека і навакольным асяроддзем, зберагчы тое каштоўнае ў беларускай прыродзе, што засталося нам у спадчыну, — зялёныя лясныя масівы і водна-балотныя ўгоддзі, рачныя і азёрныя экасістэмы, лугі і палі і іх насельнікаў.

У справе аховы навакольнага асяроддзя ўжо шмат чаго ўдалося дасягнуць. Беларусь уключана ў першую трацiну краін з найлепшымі паказчыкамі ў дачыненні да аховы прыроды і ў першую дзясятку лясных дзяржаў Еўропы. Наша краіна таксама ўваходзіць у лік сусветных лідараў па аднаўленні парушаных балотных экасістэм. Захаванне рэдкіх відаў жывёл і раслін застаецца адным з прыярытэтаў дзяржаўнай прыродаахоўнай палітыкі. У нас скарачаюцца выкіды ў атмасферу забруджвальных рэчываў і парніковых газаў. Таксама ўдасканальваецца сістэма абыходжання з адходамі. Пашыраецца і выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі. Пераход на «зялёныя» тэхналогіі стаў важным крытэрыем эфектыўнасці прадпрыемстваў.

Гэтыя і іншыя дасягненні былі б немагчымыя без сумесных намаганняў дзяржавы, грамадства і бізнесу. Таму выказваю глыбокую ўдзячнасць усім, хто стаіць на варце аховы навакольнага асяроддзя, каму неабыякава, на якой зямлі жыць нашым дзецям, якім паветрам дыхаць, якую ваду піць. Дзякуй вам, спецыялісты сістэмы аховы прыроды, навукоўцы, прадстаўнікі грамадскасці і бізнесу, за вашы намаганні па захаванні і прымнажэнні прыродных багаццяў, падтрыманні спрыяльнага экалагічнага становішча, папулярызацыі экалагічна дружалюбнага ладу жыцця!

Добрага вам здароўя, бадзёрасці, аптымізму і новых дасягненняў на карысць прыродзе і людзям!

**Андрэй ХУДЫК,**
**міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

Метэаклуб

# КАБ ВЕДАЦЬ УСЁ ПРА НАДВОР'Е

**Паспяховасць любой гідраметслужбы сёння залежыць ад сучасных тэхналогій. Як з іх дапамогай развіваецца Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды?**

Прагназаванне надвор'я — адна з найскладанейшых задач, вырашэнне якой немагчыма без дакладных даных наземных назіранняў і выкарыстання сучасных тэхналогій. Станоўчаму выніку паспрыяе выкананне комплексу мерапрыемстваў па мадэрнізацыі, тэхнічным пераўзбраенні і выявдзенні на высокі тэхналагічны ўзровень усіх элементаў узаемазвязаных сістэм атрымання гідраметэаралагічнай інфармацыі.

Для павышэння якасці прагназавання пагодных умоў Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя была распрацавана Дарожная карта па ўдасканаленні прагназавання надвор'я на кароткатэрміновую і сярэднетэрміновую перспектыву на 2018—2020 гады. Комплекс яе мерапрыемстваў уключае не толькі тэхнічныя аспекты (мадэрнізацыя і пашырэнне сеткі назіранняў, тэхнічнае пераабсталяванне, мадэрнізацыя лакальнай вылічальнай сеткі), але і работу з кадравым складам, са спажыўцамі, паляпшэнне іміджу Белгідрамета і іншае.

— Згодна з дарожнай картай, да канца 2020 года плануецца павялічыць агульную колькасць функцыянуючых метэастанцый да 67 (да 2018 года іх было 51) праз арганізацыю новых пунктаў назіранняў з устаноўкай на іх аўтаматычных метэаралагічных станцый (АМС) і аўтаматызацыі ўсіх дзеючых пунктаў назіранняў, — расказаў **начальнік службы метэаралагічных прагнозаў Аляксандр БЯГАНСКІ.** — Летась набыты і ўстаноўлены дзевяць АМС на дзеючых пунктах назіранняў у Высокім, Навагрудку, Оршы, Шаркаўшчыне, Драгічыне, Жыткавічах, Лынтупах, аграгарадку Палескі (Лунінецкі раён) і Браславе.


Фота Аксаны ЯНОЎСКАЙ.

На дакладнасць прагнозаў надвор'я моцна ўплываюць і глабальныя змены клімату. Яны праяўляюцца, у тым ліку, у пераменлівым характары ападкаў. Так, па словах спецыяліста, летам 2019 года ў Беларусі склалася нестандартная сітуацыя. Дажджы, якія праходзілі на тэрыторыі краіны, насілі ліўневы характар і характарызаваліся нераўнамерным размеркаваннем і розніай інтэнсіўнасцю нават у межах аднаго горада. Для павышэння якасці абслугоўвання спажыўцоў прынята стратэгічнае рашэнне аб пашырэнні сеткі назіранняў у буйных гарадах краіны. Так, у Мінску летась дадаткова былі ўстаноўлены шэсць аўтаматычных метэаралагічных станцый.

Сёлета адноўлены назіранні ў гарадскім пасёлку Лельчыцы — на самай паўднёвай станцыі краіны. У мэтах пашырэння сеткі назіранняў на 2020 год запланаваны ўвод у эксплуатацыю сямі новых пунктаў назіранняў у населеных пунктах Навасёлкі, Іўе (Гродзенская вобласць), Плешчаніцы (Мінская вобласць), Малараta, Кобрын (Брэсцкая вобласць), Расоны (Віцебская вобласць), Вялікі Мяжнік (Магілёўская вобласць).

Пашыраецца і сетка радыёлакацыйных назіранняў Белгідрамета — сёння яна складаецца з пяці лакатараў, аб'яднаных у адзіную сістэму. У пачатку жніўня доплераўскі метэаралагічны радыёлакатар запрацаваў у аэрапорце Гродна.

**Выкарыстанне дакладнай інфармацыі пра надвор'е і клімат дазваляе органам дзяржкіравання прымаць важныя рашэнні, а прадпрыемствам і арганізацыям — выбіраць правільную стратэгію развіцця сваёй гаспадарчай дзейнасці. Бо дзякуючы своечасова прынятым ахоўным мерам зводзіцца да мінімуму шкода ад уздзеяння небяспечных і неспрыяльных гідраметэаралагічных з'яў.**

— Развіццё сеткі метэаралагічных радыёлакатараў на тэрыторыі Беларусі дазволіць стварыць адзінае радыёлакацыйнае поле і павялічыць своечасовасць і дакладнасць штармавых папярэджанняў аб неспрыяльных і небяспечных метэаралагічных з'явах надвор'я, — адзначыў Аляксандр Бяганскі.

У снежні 2018 года з уводам у эксплуатацыю метэаралагічнай станцыі Мінск у раёне ваеннага гарадка Уручча аднаўлена радыёзандзіраванне атмасферы з дапамогай сучаснай аэралагічнай сістэмы DigiCORA. Яна дазваляе атрымаць тэмпературна-ветравы профіль атмасферы на розных вышынях. Даныя аэралагічных назіранняў у Мінску, Брэсце і Гомелі шырока выкарыстоўваюцца пры прагназаванні надвор'я, небяспечных і неспрыяльных гідраметэаралагічных з'яў.



Для ўмацавання кадравага патэнцыялу Белгідрамета на пастаяннай аснове праводзіцца павышэнне прафесійнай кваліфікацыі кадраў на базе навучальных устаноў Расгідрамета, Еўрапейскага саюза і Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі. У 2019 годзе на курсах павышэння кваліфікацыі па пытаннях прагназавання надвор'я, у тым ліку небяспечных з'яў, на бязвыплатнай аснове прайшлі навучанне 14 спецыялістаў-сіноптыкаў.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Інвазійныя расліны

# Фальшывае золата сумніку

## Не дайце кветкам ператварыцца ў насенне!

**У жніўні ды верасні па лугах і ўзгорках, на ўскрайках лясоў ды па вясковых палісадах зіхацяць золатам суквецці сумніку канадскага. У гэтую пару ён найбольш прыкметны. Аднак яшчэ далёка не ўсе ведаюць, што за прывабным дэкаратыўным выглядам крыецца вялікая шкода чужароднага «заваёўніка» для нашай прыроды. Сумнік хутка распаўсюджваецца, бо яго не ядуць мясцовыя жывёлы і не чапаюць паразіты. Ён выдзяляе інгібітары — рэчывы, якія прыгнятаюць рост навакольных раслін. Так знікае біяразнастайнасць. На захопленых сумнікам тэрыторыях немагчыма пасвіць свойскіх жывёл, знікае харчовая база і для дзікіх звяроў, птушак, насякомых.**

Кожны экземпляр сумніку можа даць да 100 тысяч сямян, іх усходжасць дасягае 95 %. Таму вельмі важна знішчаць гэты інвазійны від менавіта цяпер, у фазе цвіцення.

— Самы дзейсны і экалагічны метад барацьбы з сумнікам — кашэнне, — кажа **кіраўнік сектара раслінага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Алег МАСЛОЎСКІ.** — Канадскі інтрадуцэнт з цяжкасцю адрастае нанова, і за два гады рэгулярнага кашэння можна цалкам ад яго пазбавіцца. Аднак майце на ўвазе: калі не прыбраць суквецці, зрэзаныя ў позняй фазе цвіцення, яны здольныя даспець пры сонечным надвор'і, і насенне зноў трапіць у глебу. Таму неабходна ўтылізаваць сцяблiны з кветкамі. Спелы сумнік з пухам кшталту дзьмухаўцовага небяспечны яшчэ і тым, што лёгка ўзгараецца і можа стаць прычынай пажараў. Таксама ён з'яўляецца моцным алергенам.


**Сумнік канадскі ў рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Прылепскі» (Мінскі раён).**

Барацьба з інвазійнымі відамі раслін вядзецца на дзяржаўным узроўні. Па ўсёй краіне плошча, на якой расце сумнік канадскі, складае 2877,3 гектара. Сёлета ў перыяд з красавіка да 15 жніўня ў Брэсцкай вобласці апрацавана ад сумніку 70,86 гектара тэрыторыі, у Віцебскай — 599,45 гектара, у Гомельскай — 29,41 гектара, у Гродзенскай — 1560,24 гектара, у Магілёўскай — 303,07 гектара, у Мінскай — 1246,66 гектара, у самім Мінску — 212,73 гектара. Усяго па краіне за чатыры з паловай месяцы — больш за 4000 гектараў. Некаторыя тэрыторыі апрацоўвалі шматразова, адсюль і такая лічба.

— У адпаведнасці з артыкулам 9 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб раслінным свеце» кожны ўласнік тэрыторыі мусіць не дапускаць распаўсюджвання інвазійных відаў, — нагадвае **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Важна падтрымліваць устойлівае прыродакарыстанне з захаваннем біяразнастайнасці, далучаць пустуючыя землі да гаспадарчага абароту.

За непрыняцце або нясвоечасовае прыняцце мер для рэгулявання распаўсюджвання сумніку землеўласнік будзе атрымліваць прадпісанне ад тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды, а ў выпадку яго невыканання — прыцягвацца да адказнасці згодна з артыкулам 23.1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Пастановай Мінпрыроды ад 16 ліпеня 2020 года № 5-Т зацверджаны і ўводзіцца ў дзеянне з 1 кастрычніка гэтага года тэхнічны кодэкс устаноўленай практыкі (ТКП) 17.05-03-2020 (33140) «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Раслінны свет. Патрабаванні да правядзення работ па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін (баршчэўніку Сасноўскага, сумніку канадскага, эхінацыстыцу лопасцевага і іншых інвазійных раслін) рознымі метадамі» з правам датэрміновага прымянення.

— Кожны жыхар нашай краіны, нават школьнік, можа паўдзельнічаць у ліквідацыі сумніку канадскага, — упэўнены Мікалай Свідзінскі. — Давайце разам паставім заслон шкоднаму інтрадуцэнту!

**Святлана ІШЧАНКА, фота аўтара.**

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 16 (147) Вторник, 25 августа 2020 года Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц Издается с 26 апреля 2014 года

# ПЕРЕСЕЧЬ ГРАНИЦЫ ПАНДЕМИИ

## На кого из белорусов не распространяется запрет на въезд в Россию из-за COVID-19

**Моя знакомая, артистка по профессии, работала в России, с введением карантина решила переждать его в родном Минске. Домой приехала налегке — рюкзак с вещами первой необходимости. Весь основной багаж оставила в жилье, выделенном ей наймодателем. Время прошло, карантин и ограничения сняли, но и контракт закончился. Стали с подругой разбираться, как ей забрать нажитое в режиме закрытых границ.**



Фота БелТА.

Сразу оговорюсь: в минувшую среду белорусский Совет Министров сообщил, что во время телефонного разговора премьеров Романа Головченко и Михаила Мишустина достигнуты договоренности о совместной работе ведомств двух стран по снятию ограничения на передвижение через белорусско-российскую границу. Об этом же говорили и руководители МИДов во время телефонного звонка в конце недели. Вероятно, очень скоро всех желающих въехать в Россию ждут приятные новости. Ну а пока о том, что имеем сегодня.

В середине марта правительство России в целях защиты здоровья населения и нераспространения коронавирусной инфекции временно ограничило въезд иностранных граждан, в том числе прибывающих из нашей страны.

Пересекать границу с территории Беларуси разрешили лишь гражданам России и белорусам с видом на жительство в стране-соседке. Исключение сделали для иностранцев, которые ехали на похороны близких родственников или к таковым в гости. Под близкими родственниками здесь понимаются супруги, родители, дети, усыновители, усыновленные, опекуны и попечители. Позднее разрешили въезд белорусам-вахтовикам, которые принимают участие в работах по обеспечению бесперебойного производственного процесса на промышленных объектах в сферах ядерной энергетики, строительства, добычи нефти и газа, переработки полезных ископаемых. Пересекать границу с Россией смогут также участники космических программ.

Новым распоряжением российского правительства с 6 июня въезд разрешили тем, кто едет на лечение и кто направляется ухаживать за больными близкими родственниками.

Первым кроме документа, удостоверяющего личность, и визы (если она нужна), необходимо предъявить справки, выданные медицинской организацией, подтверждающие приглашение на лечение, или документы, оформленные Минздравом России.

Лицам, однократно въезжающим в Россию к нуждающимся в уходе близким родственникам, необходимы следующие документы: удостоверяющие их личность, визы (в случае визового режима), а также справки, выданные медицинской организацией, подтверждающие состояние, и копии документов, в которых указана степень родства.

К последним могут относиться свидетельства о заключении брака, свидетельства о рождении, записи в паспорте, которые подтверждают заключение брака, рождение детей, судебные решения об усыновлении, удочерении, справки, выданные органом ЗАГС или иным учреждением, располагающим соответствующими архивами.

Кроме вышеперечисленных документов необходимо предъявить пограничникам справку, подтверждающую отсутствие коронавирусной инфекции. Материал для лабораторного исследования должен быть взят методом полимеразной цепной реакции (ПЦР) и не позднее, чем за три дня до прибытия на территорию России. Альтернатива — справка о выявлении антител иммуноглобулина G (IgG).

Если такого документа нет, придется пройти обследование на «ковид» в течение трех дней в России за соответствующую плату.

Как возможность попасть в Россию многие рассматривали авиарейсы, возобновление которых анонсировалось не единожды. Но компания «Белавиа» очередной раз продлила приостановку рейсов во все населенные пункты России до 14 сентября.

На официальной странице посольства Казахстана в Беларуси в «Фейсбуке» предупреждают, что с 11 мая 2020 года на период карантинных ограничений временно ограничено пересечение государственной границы этой страны гражданами Республики Казахстан и иностранцами. Исключение составляют 32 категории граждан. Среди них — дипломаты, члены официальных делегаций, граждане Республики Казахстан, являющиеся сотрудниками международных организаций, граждане Российской Федерации и члены их семей, направляющиеся на территорию комплекса «Байконур», и некоторые другие.

**Мария ДАДАЛКО.**

Как сообщает Министерство науки и высшего образования Российской Федерации, для тех иностранных студентов, которые не смогут вернуться к началу занятий, Минобрнауки России совместно с российскими вузами прорабатывает различные форматы начала учебного года. Один из них — изучение образовательных программ в дистанционном режиме до снятия ограничений.

В 2019/20 учебном году в России обучалось около трехсот тысяч иностранных студентов. С начала эпидемии многие из них вернулись домой и продолжили учебу в дистанционном формате. В Департаменте государственной политики в сфере высшего образования отметили, что перенос начала 2020/21 учебного года на более поздний срок не планируется. Дальнейшие решения будут зависеть от эпидемиологической ситуации в конкретном субъекте Российской Федерации.

20 августа правительством **Кыргызской Республики** были упрощены условия въезда в страну граждан иностранных государств и лиц без гражданства. В соответствии с изданным распоряжением разрешено въезжать иностранцам, обучающимся в вузах страны, лицам, имеющим постоянный вид на жительство, и гражданам, направляющимся на лечение в медицинские учреждения, а также гражданам, следующим на похороны близких родственников.

На следующий день, 21 августа, официальный сайт о коронавирусе в Кыргызстане covid.kg опубликовал перечень иностранных государств, в которых наблюдаются снижение коронавирусной инфекции и стабилизация эпидемиологической ситуации для въезда граждан этих стран в Кыргызскую Республику. В перечень вошло 31 государство, в том числе Беларусь, Россия, Армения и Казахстан.

— У апошнія гады ўзровень здабычы нафты ў нашай краіне стабілізаваўся і складае 1,7 мільёна тон. Усяго ж выяўлена 87 радовішчаў, з якіх распрацоўваецца 60. У мэтах адкрыцця новых радовішчаў і павелічэння агульных запасаў нафты ў краіне штогод забяспечваецца прырост яе здабычы.

За апошнія чатыры гады РУП «НВЦ па геалогіі» забяспечыла прырост папярэдне ацэненых запасаў нафты ў аб'ёме 3,463 мільёна тон (115,4 % ад установленага паказчыка на 2016—2020 гады). РУП «ВА «Беларуснафта» сумесна з НВЦ па геалогіі забяспечыла прырост запасаў нафты прамысловых катэгорый у аб'ёме 4,016 мільёна тон, або 79,2 % ад устаноўленага паказчыка на 2018—2020 гады (5,07 мільёна тон).

***— Васіль Юр'евіч, ці дастатковая ў нас сваіх карысных выкапняў, неабходных для будаўнічай галіны?***

— На тэрыторыі Беларусі разведаны шматлікія радовішчы будаўнічых матэрыялаў: цэментнай сыравіны, будаўнічага каменю, пяску, глін, якія выкарыстоўваюцца ў натуральным выглядзе або пасля адпаведнай тэхналагічнай перапрацоўкі. Таксама створаны значны рэзерв для большасці горназдабываючых прадпрыемстваў. На базе радовішчаў паспяхова функцыянуюць такія прадпрыемствы, як ААТ «Беларускі цэментны завод», ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», ААТ «Крычаўцэментнашыфер», РУВП «Граніт», ААТ «Даламіт» і іншыя. У першым паўгоддзі забяспечаны прыросты прамысловых запасаў будаўнічых пяскоў, пясчана-гравійнай сумесі і будаўнічага каменю.

***— Якія карысныя выкапні ў нас, так бы мовіць, залішнія і, адпаведна, экспартуюцца?***

— У нашай краіне дастаткова радовішчаў, якія не распрацоўваюцца па шэрагу прычын, у тым ліку таму, што яны з'яўляюцца рэзервовымі. З 86 разведаных і падрыхтаваных для распрацоўкі радовішчаў торфу распрацоўваюцца 39, з больш за 200 радовішчаў пясчана-гравійнага матэрыялу распрацоўваюцца каля 130, з 94 радовішчаў сапрапелю — 13.

Што да экспарту, найбольшая ўдзельная вага ў 2016—2019 гадах у колькасным выражэнні прыпадае на гальку, жвір, друз — 37 мільёнаў 817 тысяч тон. Пры гэтым у грашовым эквіваленце найбольшую ўдзельную вагу мае экспарт сырой нафты, газавага кандэнсату — 2 мільярды 615 мільёнаў долараў ЗША (за 2016—2019 гады). Усяго экспарт мінеральнай сыравіны ў названы перыяд склаў 3 мільярды 638 мільёнаў долараў ЗША.

Аналіз экспарту ў 2016—2019 гадах мінеральнай сыравіны паказвае, што найбольшы яго аб'ём у колькасным выражэнні прыпадае на 2017 год і складае 14 мільёнаў 271 тысячу тон. Разам з тым у грашовым эквіваленце пераважае 2018 год, калі сума экспартаванай мінеральнай сыравіны склала 996 мільёнаў 579 тысяч долараў ЗША.

Па экспарце калійных угнаенняў Беларусь уваходзіць у тройку сусветных лідараў.

***— А што можна сказаць пра імпарт мінеральнай сыравіны?***

— Найбольшая ўдзельная вага імпарту ў грашовым эквіваленце належыць сырой нафце, газаваму кандэнсату — 22 мільярды 712 мільёнаў долараў ЗША за перыяд 2016—2019 гадоў.

Звяртае на сябе ўвагу рэзкі рост у 2019 годзе імпарту бурага вугалю — 48,8 тысячы тон, або ў 3,8 раза да паказчыкаў 2016—2018 гадоў. Рэзюмуючы, адзначу, што ў 2016—2019 гадах імпарт мінеральнай сыравіны перавысіў яе экспарт у 6,3 раза.

***— З якімі праблемамі сутыкаецца галіна?***

— Назаву тры з іх. Адной з асноўных праблем геалагічнай галіны з'яўляецца марудная амаладжэнне кадраў. Разам з тым трэба адзначыць, што за пару апошніх гадоў прэстыж прафесіі геолага сапраўды стаў павышацца, вядома, не так, як у савецкія часы, аднак працэс ідзе. Тая палітыка, якую праводзяць Мінпрыроды, падпарадкаванае яму прадпрыемства «НВЦ па геалогіі», Белдзяржуніверсітэт, накіравана на павышэнне прэстыжу прафесіі сярод моладзі і дае свой плён. Ужо з 2017 года ў краіне становіцца папулярным рух «Юныя геолагі». Каманда з Беларусі паспяхова ўдзельнічае ў міжнародных палявых алімпіядах і займае прызавыя месцы, на роўных супернічаючы з камандамі Казахстана, Расіі і іншых краін СНД. У развіцці гэтага руху хочацца адзначыць таксама ролю беларускай кампаніі «Сохра».

Другой праблемай назаву мадэрнізацыю геолагаразведачнай галіны. Гэтае пытанне знаходзіцца на парадку дня, бо геалогіі без матэрыяльна-вытворчай базы не бывае. Замены патрабуе досыць вялікая колькасць састарэлай і маральна зношанай свідравіннай, геафізічнай, лабараторнай, аўтатранспартнай і іншай дапаможнай тэхнікі. Работу па мадэрнізацыі галіны мы плануем пачаць у бліжэйшай пяцігодцы.

Трэцяй праблемай можна пазначыць непланамернае ўцягванне ў прамысловую распрацоўку вялікай колькасці радовішчаў.

Нягледзячы на штогадовае забеспячэнне прыросту запасаў карысных выкапняў, па многіх іх відах праблемным застаецца пытанне незапатрабаванасці ў шэрагу галін айчыннай прамысловасці. Гэта, у сваю чаргу, не дазваляе дзяржаве ў поўнай меры атрымліваць эканамічны эфект у выглядзе падатку за здабычу прыродных рэсурсаў ад бюджэтных сродкаў, укладзеных дзяржавай у разведку радовішчаў, і скарачаць імпарт мінеральнай сыравіны.

Таксама трэба адзначыць недастатковасць мер, якія прымаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па прыцягненні інвестыцый у геалагічнае вывучэнне нетраў і распрацоўку радовішчаў карысных выкапняў.

Нагадаю, што зацверджаны пералік аб'ектаў, прапанаваных для перадачы ў канцэсію, якіх зараз налічваецца 16. Сярод іх можна вылучыць чатыры радовішчы ў Гомельскай вобласці — Брынеўскае (гіпс), Астражанскае (бентанітавыя гліны), Добрушскае (мел), Марозаўскае (нафта); у Брэсцкай вобласці — Гароднае (кварцавыя пяскі); у Віцебскай вобласці — радовішча Асінторфскае (даламіт).

Распрацоўка гэтых радовішчаў, стварэнне на іх базе новых вытворчасцяў дазволілі б павышаць узровень дабрабыту насельніцтва краіны, у тым ліку на раённым і абласным узроўнях, і скарачаць імпарт мінеральнай сыравіны. Таму Мінпрыроды неаднаразова рэкамендавала мясцовым выканаўчым і распарадчым органам уключацца ў работу па прыцягненні інвестыцый у асваенне нетраў нашай краіны.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Бурэнне свідравіны пры сейсмаразведцы.

# «Раскажы пра сваю крыніцу»: папярэднія вынікі

**Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў з 5 чэрвеня да 15 ліпеня 2020 года ў рамках інфармацыйнай кампаніі «Раскажы пра сваю крыніцу» правёў конкурс на найлепшыя работы па інвентарызацыі крыніц малой радзімы.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Да ўдзелу ў конкурсе запрашаліся ўсе ахвотныя, а праходзіў ён у фармаце анлайн, — расказала **вучоны сакратар інстытута Ганна ГРЫБ.** — Паводле папярэдніх вынікаў стала вядома, што ў ім узялі ўдзел больш за 60 чалавек, абследавана больш за 200 крыніц, з іх упершыню выяўленых і абследаваных — 76. Даслана больш за 700 фотаздымкаў крыніц і больш за 10 відэаматэрыялаў.

Падрабязная інфармацыя пра вынікі конкурсу і яго пераможцаў будзе размешчана ў найбліжэйшы час на сайце ЦНДІКВВР. Урачыстае ўзнагароджанне пераможцаў адбудзецца на VI Міжнародным водным форуме «Крыніцы Беларусі», які пройдзе ў Мінску з 3 да 4 лістапада.

А пакуль РУП «ЦНДІКВВР» выказвае вялікую ўдзячнасць усім удзельнікам конкурсу!

# На «зялёнай» кансультацыі

**З ліпеня 2020 года Рэспубліканскім цэнтрам дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі Мінпрыроды ўкаранёна экалагічная кансультацыйная паслуга «Праектаванне, будаўніцтва, эксплуатацыя».**

Спецыялісты цэнтра пракансультуюць, растлумачаць, выдадуць рэкамендацыі, а таксама правядуць ацэнку праблем і спосабаў іх вырашэння па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў у адносінах да аб'ектаў будаўніцтва ці іншай дзейнасці.

Прапанаванае кансультацыйна-экспертнае суправаджэнне паспрыяе недапушчэнню магчымага негатыўнага ўплыву на навакольнае асяроддзе пры праектаванні, узвядзенні і эксплуатацыі аб'ектаў.

Дадатковую інфармацыю па ажыццяўленні кансультацыйнай паслугі можна знайсці на афіцыйным сайце цэнтра ў раздзеле «Кансультацыйныя паслугі» (https://oos.by/gosudarstvennaya-ekologicheskaya-ekspertiza/konsult/).


## ЧЫТАЙЦЕ Ў ЖНІВЕНЬСКІМ НУМАРЫ ЧАСОПІСА «РОДНАЯ ПРЫРОДА»:

**— 60 гадоў на карысць прыродзе. Спецыяльны выпуск да юбілею сістэмы аховы навакольнага асяроддзя;**

**— як зрабіць сваю школу «зялёнай»;**

**— знаёмцеся, «іншапланетны» грыб!**

**— у пошуках шкоднай чужаземкі;**

**— вызначаем узрост кошкі;**



Прыёмная кампанія — 2020

# Пабітыя леташнія рэкорды прахадных балаў

**На бюджэтную форму атрымання адукацыі сёлета ў ВНУ залічана каля 26,3 тысячы чалавек і прыкладна столькі ж — на платную, хоць на платную форму навучання планавалася набраць абітурыентаў больш. А ўсяго прыём на ўзровень вышэйшай адукацыі ажыццяўлялі 50 устаноў (42 дзяржаўныя і 8 прыватных). Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.**



Цэнтралізаванае тэсціраванне сёлета праходзіла каля 64,3 тысячы абітурыентаў, што прыкладна на 12,5 тысячы менш, чым летась. Абсалютныя вынікі (100 балаў) паказалі 323 удзельнікі, а два стабальныя сертыфікаты ЦТ атрымалі 15 чалавек (у 2019 годзе — 12).

Найбольш запатрабаванымі аказаліся спецыяльнасці ў галіне правазнаўства і міжнародных адносін. Напрыклад, на «міжнароднае права» на факультэце міжнародных адносін у БДУ прахаднымі на бюджэт былі 386 балаў. У БДМУ традыцыйна запатрабавана спецыяльнасць «стаматалогія» (383 балы). Для паступлення на «лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый» у БДЭУ трэба было мець 360 балаў.

Што датычыцца конкурсных паказчыкаў, то, напрыклад, на спецыяльнасці «дызайн» у БДУ на адно месца прэтэндавалі 12 чалавек, «эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве» ў БДТУ — 5 чалавек, «псіхалогія» ў БДПУ — 4 чалавекі, «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» у БДУІР — 7 чалавек на месца.

Па словах Сяргея Каспяровіча, сёлета, як і ў папярэднім годзе, на асобныя спецыяльнасці аб'яўляўся дадатковы набор на бюджэт, паколькі вакантнымі засталося больш чым 190 месцаў. Пераважна гэта былі спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю. Асабліва складана было прыцягнуць абітурыентаў на спецыяльнасць «заатэхнія»: 84 месцы ў дзвюх ВНУ так і засталіся незапоўненымі нават пасля дадатковага набору.

У сярэдніх спецыяльных навучальных установах на бюджэтную форму атрымання адукацыі падало дакументы больш за 24,5 тысячы чалавек і больш як 12 тысяч — на платную. Усяго на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі планавалася набраць каля 40 тысяч чалавек.

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі — начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА** расказала, што найбольш папулярныя ў абітурыентаў сталі спецыяльнасці, звязаныя з жывапісам, дызайнам і правазнаўствам. Таксама высокай цікавасцю з боку абітурыентаў традыцыйна карыстаюцца кірункі ў сферы інфармацыйных тэхналогій, спецыяльнасці медыцынскага і педагагічнага профіляў.

Прымалі дакументы ў абітурыентаў 110 каледжаў, з іх дзевяць прыватнай формы ўласнасці, а таксама 83 установы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі (гімназіі-каледжы, вучылішчы алімпійскага рэзерву).

Аляксандра Пятрова звярнула ўвагу на важнасць апераджальнай падрыхтоўкі кадраў ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, што дазваляе выпускнікам пасля іх заканчэння быць канкурэнтаздольнымі на рынку працы. Таксама ў апошнія гады ў сістэме прафесійнай адукацыі актыўна развіваюцца так званыя рэсурсныя цэнтры, якія аснашчаюцца высокатэхналагічным абсталяваннем і дазваляюць весці практыка-арыентаваную падрыхтоўку спецыялістаў. Больш за тое, установы адукацыі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, каб забяспечыць максімальны доступ усіх навучэнцаў да адпаведных спецыяльнасцяў да гэтага абсталявання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# МЕСЦАМІ — МОЦНЫЯ ДАЖДЖЫ

## Пацяплее да плюс 27 градусаў — праўда, не ўсюды

**Вось ужо сапраўды: то абсалютна суха, то як прарвала. Трэцяя дэкада жніўня напаўняе «дажджавую скарбонку». Тым не менш у многіх раёнах Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей яшчэ далёка да нормы ападкаў. На працягу рабочага тыдня ўмовы надвор'я будуць у асноўным падпарадкоўвацца атлантычным цыклонам і іх атмасферным франтам, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень будзе воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах моцныя, месцамі навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра — ад 21 да 27 цяпла.

А ў сераду ўначы па ўсходзе, удзень па захадзе краіны адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў. Уначы на большай частцы Гомельскай, Магілёўскай і па ўсходзе Мінскай, Віцебскай абласцей, а ўдзень па заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. У цэнтральных раёнах чакаюцца больш спрыяльныя ўмовы надвор'я. Вецер прагназуецца заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, удзень — 18—25 цяпла.

Бліжэй да чацвярга наша тэрыторыя апынецца пад уплывам цыклону, які перамяшчаецца з поўдня Балтыкі. Будзе пераважаць воблачнае надвор'е. Часам пройдуць дажджы, месцамі з навальніцамі. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 да плюс 16 градусаў, удзень ва ўмовах дэфіцыту сонечнага цяпла будзе ўсяго 16—22 градусаў.

У апошні рабочы дзень тыдня цыклон будзе перамяшчацца на паўночны ўсход кантынента, углыб Расіі. Таму аблокаў і дажджоў стане менш. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні з пераходам у дзённыя гадзіны на паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 да 14 градусаў, удзень будзе ад 17 па паўночным усходзе да 26 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у апошнія выхадныя жніўня сінаптычную ініцыятыву перахопіць сонечны антыцыклон з цэнтрам над Украінай. Дзякуючы гэтаму жыхарам Беларусі чакае годнае развітанне з летам. У дзённыя гадзіны будзе цёпла, а па поўдні краіны — нават горача. У асноўным абыдзецца без ападкаў, толькі па паўночным захадзе краіны магчымыя кароткія летнія дажджы. Але хутка восень...

**Сяргей КУРКАЧ.**

Зважай!

# БЯСПЕКА ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ ПЕШАХОДАЎ

**Да старту новага навучальнага года застаецца ўсяго тыдзень. У гэтыя дні дзеці пакрысе вяртаюцца ў гарады пасля летняга адпачынку. За час, праведзены ў невялікіх населеных пунктах, яны адвыклі ад таго, што дарога ў горадзе можа несці небяспеку. Менавіта таму ДАІ абвяшчае спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага — дзеці!».**

Яно пройдзе з 25 жніўня да 5 верасня і скіравана на тое, каб прадухіліць дзіцячы траўматызм на праезных частках.

— Супрацоўнікі органаў унутраных спраў наведаюць урачыстыя лінейкі, правядуць з вучнямі класныя гадзіны, конкурсы, віктарыны, кіналекторыі, спартыўна-навучальныя заняткі, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства ўнутраных спраў. — Гэта неабходна для таго, каб нагадаць дзецям, што на дарогах неабходна зважаць на правілы бяспекі. Супрацоўнікі міліцыі адправяцца на дзяжурствы паблізу школ і ў тыя месцы, дзе рухаецца шмат дзяцей-пешаходаў.

У сваю чаргу, інспектары ДАІ будуць сачыць за тым, каб дарослыя перавозілі дзяцей у аўтамабілях з выкарыстаннем спецыяльных аўтакрэслаў. Асобная ўвага будзе таксама звернута на праезд пешаходных пераходаў і спыненне транспартных сродкаў.

— У пятніцу мы правядзём па ўсёй краіне адзіны дзень бяспекі дарожнага руху, — адзначылі ў прэс-службе. Яго назвай стаў заклік: «Будзьце прыкладам свайму дзіцяці». Інспектары ДАІ завітаюць у працоўныя калектывы, дзе растлумачаць дарослым прычыны і наступствы дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей, а таксама нагадаюць пра правільную іх перавозку.

ДАІ таксама інфармуе, што ў гэтыя дні транспарт абавязкова мусіць рухацца з уключаным блізкім святлом фар.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# БЕЗ ПЛАСТЫКУ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Пры гэтым біяпалімерныя адходы не павінны змешвацца з іншымі відамі пластыку, у тым ліку оксарасскладальнымі. Для гэтага патрэбна распрацаваць стандарты, звязаныя з патрабаваннямі да біяраскладальнасці ўпакоўкі і яе вытворчасці, чым цяпер займаецца Дзяржстандарт.

Як паведаміла Вольга Сазонава, плануецца ўнесці змяненні ў Тэхнічны рэгламент Мытнага саюза «Аб бяспецы ўпакоўкі». Плануецца абмяжаваць выкарыстанне ПВХ-этыкетак на ўпакоўцы ПЭТ, лёгкіх фасовачных поліэтыленавых пакетаў на аб'ектах рознічнага гандлю, упакоўкі для харчовай прадукцыі з успененага полістыролу.

Прымяняюцца і эканамічныя механізмы. Так, з красавіка бягучага года стаўка платы за збор адходаў для вытворцаў і імпарцёраў біяраскладальнай тары і ўпакоўкі зніжана ў два разы. А з 1 студзеня 2021 года ў краіне будуць забаронены выкарыстанне і продаж аднаразовага пластыкавага посуду ва ўсіх аб'ектах грамадскага харчавання.

— Увесь свет абмяжоўвае як вытворчасць, так і выкарыстанне аднаразовых пластыкаў. Як толькі ўводзяцца забароны і абмежаванні, гэтыя патокі пераразмяркоўваюцца ў тыя краіны, дзе не прынятыя адпаведныя меры. Мы не павінны стаць звалкай такіх тавараў і адходаў, — упэўнена Вольга Сазонава.

## Бяспечны пластык і суперпапера

У напрамку паэтапнага зніжэння выкарыстання палімернай упакоўкі з яе замяшчэннем на экалагічна бяспечную актыўна працуе Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. **Намеснік старшыні яе прэзідыума, акадэмік, доктар біялагічных навук, прафесар Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ** расказаў, што навуковыя інстытуты НАН працуюць у двух кірунках: атрыманне малочнай кіслаты і полілактыду з далейшым вырабам біяраскладальнай плёнкі і стварэнне розных відаў паперы, якая таксама зможа натуральна раскладацца.

Інстытут мікрабіялогіі займаецца атрыманнем малочнай кіслаты на аснове рознай арганічнай сыравіны. На базе інстытута ствараецца спецыяльны вопытна-прамысловы ўчастак для атрымання малочнай кіслаты і біяраскладальнага полілактыду.

Інстытут хіміі новых матэрыялаў сумесна з Інстытутам механікі металапалімерных сістэм займаецца полілактыдам і стварэннем з яго розных прадуктаў як для харчовай, так і для прамысловай галін. **Уладзімір АГАБЕКАЎ, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук, прафесар,** расказаў, што цяпер вучоныя на аснове полілактыду, закупленага за мяжой, займаюцца вывучэннем яго біяраскладальнасці, а таксама спрабуюць зменшыць тэрмін раскладання з дапамогай дадатковых натуральных кампанентаў.

Па словах Аляксандра Кільчэўскага, да канца года на базе Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі плануецца стварыць лабараторыю, дзе можна будзе выпрабоўваць усю прадукцыю на біяраскладальнасць.

**«Колькі б мы ні гаварылі пра тэхналагічныя, прыродныя і іншыя магчымасці, калі мы не пачнём з сябе, ніхто нас не выратуе — ні вучоныя, ні прамыслоўцы».**

Інстытут агульнай і неарганічнай хіміі стварыў папяровы ўпаковачны матэрыял, які валодае тлушча-вільгацеўстойлівасцю. Сёння ён выпрабляецца на папяровай фабрыцы «Дзяржзнака». Распрацоўваюцца і новыя тыпы паперы, напрыклад, тэрмаўстойлівая, біяцыдная і іншыя, якія будуць мець здольнасць біяраскладацца.

Займаюцца пытаннем пераходу да экалагічна бяспечнай упакоўкі і ў канцэрне «Белляспапераправм».

Па словах **намесніка старшыні канцэрна Аляксандра ПШОННАГА,** прадпрыемствы ўжо гатовыя замяніць поліэтыленавыя пакеты на папяровыя, часткова — латкі для яек з полістыролу і поліэтылену на адпаведныя з паперы. Плануецца пачаць выпуск кардону еўрапейскай класіфікацыі для вытворчасці ўпаковачных матэрыялаў тыпу тэтрапак, а таксама сыравіны для паліграфіі, фармацэўтыкі і касметалогіі, якая цяпер завозіцца з-за мяжы. У краіне збіраюцца вырабляць і мяшочную паперу — гэта дазволіць цалкам забяспечыць адпаведнай упакоўкай цэментную і цукровую галіны.

Пры гэтым Валерый Ганчароў падкрэсліваў, што замена пластыкавай упакоўкі на біяраскладальную не павінна разглядацца як самамэта. Перш за ўсё неабходна забяспечыць мінімізацыю нагрузкі на навакольнае асяроддзе, што немагчыма без удзелу соцыуму.

— Колькі б мы ні гаварылі пра тэхналагічныя, прыродныя і іншыя магчымасці, калі мы не пачнём з сябе, ніхто нас не выратуе — ні вучоныя, ні прамыслоўцы, — адзначыў ён.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Па палічках

# РАБОЧАЕ МЕСЦА ПАД СОНЦАМ,

## або Як знайсці работу хутка

**Сёння з неабходнасцю пошуку работы людзі сутыкаюцца пастаянна. І калі яшчэ пару гадоў таму пытанне стаяла так: «Як знайсці работу сваёй мары?», то сёння яго фармулююць інакш: «Як знайсці крыніцу сродкаў да існавання хутка?» Мы пагутарылі са спецыялістамі кадравых агенцтваў, а таксама з людзьмі, якія нядаўна шукалі работу або знаходзяцца ў яе перманентным пошуку. І вось што высветлілі.**

### ПОШУК — ТАКСАМА РАБОТА

Упадабаная фраза спецыялістаў рэкрутынгавых агенцтваў: «Пошук работы — таксама работа». І ставіцца да яго трэба добрасумленна, сур'ёзна, і, галоўнае, сістэмна. Зразумела, што, страціўшы работу, чалавек знаходзіцца ў некатарай прастрацыі, а калі новая рабочае месца не знаходзіцца хутка, то і ў роспачы. Але для паспяховага далейшага пошуку важныя спакой і дакладнае планаванне сваіх дзеянняў.

Перш за ўсё, важна зразумець, што канкрэтна вы шукаеце. Прафесійная вобласць, спецыялізацыя, пасада, узровень аплаты вашай працы, графік, аддаленасць ад дому (час у дарозе), наяўнасць або адсутнасць камандзіровак, нармаваны ці ненармаваны працоўны дзень — усе гэтыя параметры вы павінны добра сабе ўяўляць.

Цяпер расстаўце прыярытэты: што для вас важна, а чым вы маглі б ахвяраваць. Напрыклад, вы згодныя на ненармаваны працоўны дзень дзеля таго, каб атрымаць магчымасць на практыцы навучыцца новаму ў рамках сваёй прафесійнай кваліфікацыі. Або гатовыя працаваць не па спецыяльнасці пры ўмове добрага ўзроўню зарплаты. Такім чынам, мы атрымліваем дакладнае ўяўленне аб магчымым работадаўцы.

Толькі пасля гэтага, усвядоміўшы, што менавіта мы шукаем, прыступаем да вывучэння рынку працы. Звяртаем увагу на сярэдні ўзровень заробкаў у абранай сферы, а таксама на канкурэнтнае асяроддзе. Напрыклад, традыцыйна вялікая прапанова ў апошнія гады ў сферы продажаў. Прапанова пераважае над попытам і ў сферы дызайну і IT. Калі ўзровень канкурэнтнасці высокі, падумайце, чым вы можаце выгадна вылучацца на фоне іншых саіскальнікаў — гэта дапаможа правільна скласці рэзюмэ.

Вывучыўшы рынак, прыступаем да складання рэзюмэ. Фота — абавязкова. Без фота рэзюмэ выглядае безаблічным, а многія работадаўцы падкрэсліваюць, што не разглядаюць рэзюмэ саіскальнікаў без фатаграфіі. Фота лепш за ўсё абраць строгае і дзелавое, як на пашпарт.

Задзейнічаем усе каналы пошуку — ад сяброў і былых калег да сацыяльных сетак і месенджараў. Чым шырэйшая будзе вобласць пошукаў, тым большая верагоднасць іх хутчэйшага паспяховага завяршэння.

Размясціць рэзюмэ на сайтах пошуку работы недастаткова. Актыўна адгукайцеся на вакансіі самі. Пакідайце на прагляд сайтаў аб пошуку работы хоць бы гадзіну штодня. Чым больш будзе спробаў з вашага боку, тым больш запрашэнняў на гутарку вы атрымаеце.

Калі работадавец просіць аб суправаджальным лісце, напішыце яго абавязкова. Як і любы дзелавы дакумент, суправаджальны ліст пішацца не ў адвольнай форме, а згодна з дакладнай структурай: прывітанне; інфармацыя пра тое, чаму варта ўзяць на гэтую вакансію вас (ваш прафесійны вопыт, навыкі і веды адпавядаюць патрабаванням работадаўца); інфармацыя, чаму вы самі хочаце працаваць у кампаніі работадаўца (пашукайце інфармацыю аб кампаніі ў інтэрнэце і выкарыстоўвайце яе ў сваім адказе). Як з вамі звязацца (тэлефон, электронная пошта).

Збіраючыся на інтэрв'ю з работадаўцам, прадумайце, як падаць сябе. Калі мяркуецца выкананне тэставага задання падчас сумоўя, пашукайце водгукі іншых саіскальнікаў рабочага месца ў гэтай кампаніі і па магчымасці патрэніруйцеся загадзя.

І нарэшце: не ўпадаем у роспач, калі вашае рэзюмэ застаецца непрагледжаным або калі вам раз за разам адмаўляюць. Як паказвае практыка, на пошук работы ў сярэднім патрэбна ад 2 да 5 месяцаў. Не страчвайце веры ў сябе. Рана ці позна ўсё вырашыцца найлепшым чынам.

### ДЗЕ ЯЕ ШУКАЦЬ?

Кірункаў пошукаў работы павінна быць шмат. І лепш задзейнічаць іх як мага больш.

***Сваякі і сябры.*** А таксама былыя калегі і былыя кіраўнікі, аднакласнікі, сябры сяброў і нават былыя каханыя (калі вы ў добрых адносінах, вядома) — чым больш людзей будзе ў курсе, што вы ў пошуках работы, тым больш шанцаў, што рабочае месца для вас знойдзецца хутка. Спішыцеся з тымі, з кім даўно не мелі зносін, і спытайце аб наяўнасці свабодных вакансій там, дзе яны працуюць: магчыма, што менавіта цяпер ім патрэбныя спецыялісты. У некаторых сферах кампаніі наогул не паведамляюць аб сваіх вакансіях на спецыялізаваных сайтах, аддаючы перавагу пошукам у вузкім коле знаёмых спецыялістаў або па рэкамендацыі. Напрыклад, практычна немагчыма прыйсці «з вуліцы» ў большасць сур'ёзных IT-кампаній, у некаторыя СМІ.

**Марына, перакладчык, памочнік кіраўніка ў буйной міжнароднай кампаніі:**

— Працаўладкаванне па знаёмстве праходзіць хутчэй і прасцей. Прадстаўлены калегам або прыяцелем кандыдат выклікае больш даверу. Прычым карысныя сувязі працуюць незалежна ад кваліфікацыі спецыяліста. Мая мама працавала на адным прадпрыемстве ўсё жыццё. У наш час падобнае практычна немагчыма. Мне даводзілася шукаць работу мноства разоў, як, напэўна, і большасці людзей ад 20 да 50. І кожны раз я ў першую чаргу звяртаюся да знаёмых, сяброў і сваякоў. І, зразумела, да былых калег. Любы прафесійны круг — гэта закрытае міні-грамадства, дзе ўсе ведаюць пра ўсё і ўсіх. У тым ліку — аб адкрытых вакансіях. І калі рэпутацыя ў вас як у прафесіянала добрая, то «па знаёмых» — найлепшы спосаб шукаць працу.

***Сайты па пошуку работы.*** Самы відавочны і зручны спосаб. Праўда, там шукаюць работу ўсе. Таму — адгукацца, адгукацца і яшчэ раз адгукацца, інакш, пакуль вы будзеце разважаць, вакансія ўжо закрыецца. Не абмяжоўвайцеся адным сайтам, лепш размясціць рэзюмэ на двух-трох.

**Ігар, выкладчык па адукацыі, цяпер працуе тэсціроўшчыкам:**

— Я ўвесь час знаходжуся ў пошуку магчымасці зарабіць грошы: у мяне двое дзяцей. І работа ў мяне, як правіла, не адна. Работу я часцей за ўсё шукаю проста праз сайты. Але не ўсе яны зручныя і падаюць аператыўную інфармацыю. Мне здаецца найбольш зручным сайт HeadHunter (HH). Новыя вакансіі там з'яўляюцца кожны дзень у вялікай колькасці, і работадаўцы, як правіла, хутка даюць зваротную сувязь. Знайсці патрэбную прапанову і тэрмінова адгукнуцца на яе дапамагаюць фільтры. Калі ваша рэзюмэ ёсць на сайце, сістэма сама пачынае прапаноўваць варыянты. Прапановы работадаўцаў можна шукаць па населеных пунктах, буйных кампаніях, прафесіях, можна наладжваць фільтры па рэгіёнах, даце абнаўлення, зарплаце, тыпе занятасці, графіку. Партал генеруе прапановы дня, збірае асобныя падборкі — напрыклад, для спецыялістаў розных сфер IT, дызайнераў, маркетолагаў і г. д. Можна падпісацца на рассылку новых вакантных месцаў. Пры рэгістрацыі прапануецца сінхранізацыя з сацсеткамі: VK, Mail.ru, Facebook, Google, linkedin, «Аднакласнікі». Ёсць бясплатныя праграмы ў Google Play, App Store.



***Сацыяльныя сеткі.*** Яшчэ адзін сучасны інструмент, які дазваляе ахапіць як мага больш людзей і кампаній і абвясціць іх аб тым, што вы шукаеце работу. Тут усё працуе гэтак жа, як у выпадку з пошукам па знаёмстве. Падпішыцеся на кар'ерныя групы і старонкі, удзельнічайце ў абмеркаванні прафесійных тэм, паведамляйце пра тое, што шукаеце работу. Таксама ў сацыяльных сетках (VK, Facebook) ёсць групы, дзе работадаўцы размяшчаюць прапановы аб вакансіях.

**Лізавета, псіхолаг па адукацыі, цяпер — SMM-менеджар:**

— Зарэгіструйцеся ў LinkedIn — гэтая сацыяльная сетка створана спецыяльна для пошуку і ўстанаўлення дзелавых кантактаў. Дарэчы, яна добрая тым, што дазваляе, абыходзячы сакратароў, выйсці наўпрост на АПР-аў (асоб, што прымаюць рашэнні) вельмі многіх кампаній. Яшчэ шукаць работу можна праз месенджары. У Telegram і Viber таксама можна знайсці адпаведныя групы і каналы, дзе размяшчаюць актуальныя вакансіі.

***Сайты кампаній.*** Калі вы прыкладна ведаеце, у якой кампаніі/кампаніях хацелі б працаваць, пабывайце на іх сайтах. У раздзеле «Кар'ера» там можна знайсці вакансіі. Не бойцеся стукаць ва ўсе дзверы і праяўляць ініцыятыву: работадаўцы зацікаўлены ў ініцыятыўных супрацоўніках.

***Спецыялізаваныя газеты.*** Гэты канал можа быць эфектыўны для пошуку работы і падпрацоўкі ў пэўных сферах. І яшчэ гэта самы просты варыянт, калі вы змянілі месца жыхарства і вам даводзіцца выходзіць на новы рынак працы цалкам з нуля.

***Біржа працы.*** Мабыць, гэта — самая апошняя «саломінка», за якую варта ўхапіцца. Цэнтры занятасці насельніцтва па месцы рэгістрацыі, як правіла, прапануюць работу з нізкай аплатай і ў асноўным звязаную з фізічнай працай. Тут вы атрымаеце афіцыйны статус беспрацоўнага, невялікую матэрыяльную дапамогу па беспрацоўі і магчымасць працаўладкавацца афіцыйна. Цэнтры занятасці рэгулярна праводзяць кірмашы вакансій.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ШЧАСЛІВАГА ПЛАВАННЯ, «КАРАБЛІ»!

### ЭЛІТНЫ КВАРТАЛ ДЛЯ ЧАРГАВІКОЎ

Асобна распрацавана праграма па асваенні яшчэ адной новай пляцоўкі — тэрыторыі Санкт-Пецярбургскага квартала. Рэалізацыя яе пачнецца ўжо сёлета. Квартал вырасце ўздоўж вуліцы Сямашкі непадалёк ад 9-й бальніцы сталіцы.

Па рашэнні Мінгарвыканкама жыллё тут будзе ўзводзіцца для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У жніўні—верасні меркавалася прыступіць да яго ўзвядзення.

Усе 932 кватэры ў квартале (а гэта 62 тысячы квадратных метраў) прызначаюцца для тых, хто мае патрэбу, праўда, будаваць іх чаргавікі будуць без дзяржпадтрымкі, за свае сродкі і крэдыты. Пасля выхаду праектнай дэкларацыі да арганізатараў будаўніцтва можа прыйсці чалавек з афармленай ва ўстаноўленым парадку даведкай аб тым, што ён знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Накіраванне ад адміністрацыі на будаўніцтва не патрабуецца. Не важная ў гэтым выпадку і дата пастаноўкі на ўлік.

Па якіх цэнах прапануюць жыллё? Як растлумачыў кансультант упраўлення капітальнага будаўніцтва «Захад», якое будзе весці будоўлю, кошт будзе складвацца наступным чынам: нарміраваная плошча для членаў сям'і (па 15 «квадратаў» на чалавека) будзе ісці з пяціпрацэнтным прыбыткам заказчыка, астатняя частка — па рынкавых цэнах. Пры гэтым заказчык звяртае ўвагу на тое, што дамы Санкт-Пецярбургскага квартала першапачаткова пазіцыянаваліся як забудова бізнес-класа. Сцены будынкаў будуць зроблены з чырвонай цэглы, звонку — вентыляваны фасад, вітражнае шкленне. Комплекс абсталююць сістэмай відэаназірання. На тэрыторыі прадугледжана дарагое добраўпарадкаванне (веладарожкі па перыметры квартала, павільёны для захоўвання ровараў, гульнявыя пляцоўкі для дзяцей, альтанкі, зона для адпачынку жыхароў, дзе будзе фантан).

Пры гэтым умовы будаўніцтва падобнага жылля вельмі прывабныя, і цана павінна скласціся даступная. Вядома, будынкі незвычайныя, у іх ёсць і пентхаўсы плошчай 140 квадратных метраў з тэрасамі, але ў цэлым набор кватэр разнастайны: прыкладна 35 % — аднапакаёўкі, 40 % — «двушкі», 25 % — трохпакаёўкі. Кожная кватэра будзе прадавацца з паркоўчным месцам. Усяго ў квартале будзе дзевяць дамоў: адзін «Маяк», чатыры «Ветразі» і чатыры «Караблі». Асваенне тэрыторыі пачнецца з боку бальніцы. У першую чаргу ўвойдуць 18-павярховы аднасекцыйны «Маяк», 11—16-павярховы двухсекцыйны «Ветразь» і паркінг.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Сяргей КУРКАЧ.**

Спорт-тайм

# Беларускія валейбалісткі пераможна пачалі маладзёжны чэмпіянат Еўропы

## Што новага ў спартыўным свеце?

**У традыцыйным штотыднёвым аглядзе «Звязды» расказваем пра самыя цікавыя спартыўныя навіны.**

1. Беларускія лёгкаатлеткі выступілі на міжнародных спаборніцтвах — мемарыяле Іштвана Дзьюлаі ў Венгрыі. Турнір з'яўляецца адным з этапаў World Athletics Continental і мае залаты ўзровень у гэтай серыі турніраў. Настасся Міроньчык-Іванова перамагла ў скачках у даўжыню: у першай жа спробе яна скокнула на 6,77 м, не пакінуўшы сваім саперніцам ніводнага шанцу. Настасся на адзін сантыметр апярэдзіла ўкраінку Марыну Бех-Раманчук, якая ў пятай спробе паказала 6,76 м. На трэцім месцы — спартсменка з Венгрыі Дзіяна Лэсці з асабістым рэкордам 6,65.

У бегу з бар'ерамі бронзавы медаль выйграла Эльвіра Герман. У забегу на 100 метраў яна фінішавала з вынікам 12,96 секунды. Яе апярэдзілі лідар сусветнага сезону Надзін Віссер (12,68) з Нідэрландаў і Луца Козак (12,71) з Венгрыі. На п'едэстал паднялася яшчэ адна беларуска — Ганна Малышчык, лідар сусветнага сезону ў кіданні молата. У найлепшай спробе Ганны снарад паляцеў на 70,59 м. Такі вынік забяспечыў ёй бронзавы медаль. Далей за ўсіх молат адправіла француженка Аляксандра Тавернье — 73,09, на другім месцы польская спартсменка Мальвіна Капрон — 72,68.

2. Гандбалісты клуба «Мяшкоў Брэст» 12-ы раз сталі ўладальнікамі Кубка Беларусі. Вырашальны матч прайшоў у Пінску, дзе брэстаўчане абыгралі мінскі СКА з вынікам 26:25 (15:13). У барацьбе за трэцяе месца гандбалісты «Гомеля» перамаглі магілёўскі клуб «Машэка» — 32:31. Найлепшым гульцом «Мяшкоў Брэст» стаў Мікіта Вайлупаў, які закінуў 11 мячоў. А ў мінскім СКА вызначыўся Кірыл Самойла, што закінуў іх сем. Для клуба «Мяшкоў Брэст» гэта 12-я перамога ў Кубку Беларусі.

3. Хакеісты гродзенскага «Нёмана» з вынікам 5:0 (1:0, 1:0, 3:0) абыгралі «Магілёў» у гасцявым матчы групавой стадыі Кубка Салея—2020. Таксама ў групе В аршанскі «Лакаматыў» прымусіў капітуляваць хакеістаў «Ліды» — 5:0 (3:0, 2:0, 0:0). Акрамя таго, у гэтай групе хакеісты зборнай Беларусі U-18 здолелі разграміць «Пінскіх ястрабаў» — 7:0 (1:0, 3:0, 3:0). Вырашальны раўнд Кубка Салея адбудзецца 29—30 жніўня ў фармаце «фіналу чатырох». У першы дзень пераможцы групавой стадыі сустрэнуцца са сталічнымі «Юнацтвам» і «Дынама». На наступны дзень адбудуцца матчы за 3-е месца і вырашальны паядынак.

4. Юныя беларускія баскетбалісты прайшлі ў топ-8 каманд турніру Skills Challenge. Юнацкая каманда U-17 у фінале кваліфікацыйнага этапу была мацнейшая за румынскіх апанентаў. У барацьбе за выхад у чвэрцьфінал беларусы перамаглі каманды Уганды і Турцыі, двойчы ўстанавіўшы сусветны рэкорд — 111 ачкоў, але потым саступілі камандзе Манголіі. За выхад у паўфінал беларуская каманда спрачалася з камандай Балгарыі, але ў чвэрцьфінале нашы спартсмены ўступілі 128:126 і выбылі з барацьбы за ўзнагароды. Пераможцамі турніру сярод мужчынскіх каманд сталі прадстаўнікі Манголіі, якія перамаглі балгар з вынікам 99:124.

Турнір Global Challenge замяніў юнацкія чэмпіянаты свету, адмененыя праз пандэмію каранавіруса. Згодна з сістэмай спаборніцтваў, каманды сустракаліся паміж сабой завочна. Калектывы праходзілі эстафету на час, ход якой фіксаваўся на відэа. Запісы адпраўляліся ў офіс Міжнароднай федэрацыі баскетбола для вызначэння якасці і хуткасці баскетбольнага майстэрства.

5. Беларускія валейбалісткі з перамогі стартавалі на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы, які праходзіць у Осіеке (Харватыя) і Зеніцы (Боснія і Герцагавіна). Падапечныя Вольгі Пальчэўскай у цяжкім пяцісэтавым паядынку абыгралі зборную Сербіі — 3:2 (16:25, 25:21, 25:21, 20:25, 15:13). Нападаючая беларускай каманды Ксенія Лябедкіна стала найлепшым гульцом матча, набраўшы 22 ачкі. Дар'я Саўчук была прызнана найлепшай блакіруючай сустрэчы, пасля таго як пяць разоў спыняла атакі сапернікі. Усяго ж на яе рахунку 14 ачкоў. Яшчэ 12 ачкоў для каманды Беларусі зарабіла Дар'я Борыс.

«Я вельмі задаволеная вынікам. Гэта быў цяжкі матч і вельмі важная перамога. Цяжка змагацца супраць каманды з высокімі гульцамі, у якіх высокі скачок і выдатны блок. Вельмі добра паказалі сябе ў абароне. Кожная каманда хоча выйграць. Мы таксама. Спадзяюся, што падчас чэмпіянату будзем гуляць вельмі добра, а калі атрымаецца, пазмагаемся за медаль», — пракаментавала вынік сустрэчы трэнер зборнай Беларусі Вольга Пальчэўская.

Таксама ў гэтай групе адбыўся матч паміж валейбалісткамі Польшчы і Славакіі. З лікам 3:0 (27:25, 25:15, 25:18) перамогу атрымалі польскія спартсменкі. Далей каманда пад кіраўніцтвам Вольгі Пальчэўскай паспрачаецца з дружынамі Польшчы і Босніі і Герцагавіны.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.06 | 20.16 | 14.10 |
| Віцебск — | 5.53 | 20.08 | 14.15 |
| Магілёў — | 5.56 | 20.06 | 14.10 |
| Гомель — | 5.56 | 19.59 | 14.03 |
| Гродна — | 6.21 | 20.30 | 14.09 |
| Брэст — | 6.26 | 20.27 | 14.01 |

## Месяц

*Першая квадра ў 20.57. Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

*Пр. Аляксандра, Аляксея, Антона, Аркадзя, Вячаслава, Дзмітрыя, Івана, Пятра, Сяргея, Якава, Яфіма.*
***К.** Луізы, Рыгора, Юзафа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 25 ЖНІЎНЯ

**У краіне**

**1905** год — нарадзіўся Мікалай Аляксандравіч Лазараў, беларускі оперны спявак (драматычны тэнар), заслужаны артыст Беларусі.



**1910** год — нарадзіўся Уладзімір Іванавіч Корбан, пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. З 1952 года працаваў у часопісе «Вожык» (з 1967-га — галоўны рэдактар). Аўтар баек, гумарыстычных і сатырычных фельетонаў.

**1930** год — нарадзіўся Міхаіл Мікалаевіч Салдатаў, музыкант, дырыжор, педагог, заслужаны дзеяч культуры Беларусі.

**1935** год — нарадзіўся Уладзімір Канстанцінавіч Коршук, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Беларусі.

**1940** год — нарадзіўся Васіль Аляксандравіч Бондар, беларускі вучоны, кандыдат фізіка-матэматычных навук, прафесар.

**1945** год — нарадзіўся Аляксандр Леанідавіч Брухацкі, расійскі і беларускі акцёр, заслужаны артыст Расіі.

**1955** год — нарадзіўся Міхаіл Аляксандравіч Рысаў, оперны спявак (бас). У 1983-м скончыў Беларускую кансерваторыю. Лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў, XI Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя М. Глінкі.

**У свеце**

**1800** год — нарадзіўся Фёдар Іванавіч Іардан, рускі мастак-гравёр.

**1830** год — у Бруселі пачалася буржуазная рэвалюцыя супраць галандскага панавання (бельгійская рэвалюцыя 1830 года). 4 кастрычніка часовы ўрад абвясціў незалежнасць краіны.

**1930** год — нарадзіўся Шон Конеры, брытанскі акцёр, прадзюсар. Першы выканаўца ролі агента 007 у «Бандзіяне». Здымаўся таксама ў фільмах «Імя ружы», «Індыяна Джонс і апошні крыжовы паход», «Недатыкальныя» і іншых. Уладальнік шматлікіх узнагарод за ўнёсак у сусветны кінематограф.



У гэты ж дзень нарадзіўся Георгій Мікалаевіч Данелія, расійскі і грузінскі кінарэжысёр, сцэнарыст, народны артыст СССР. Зняў фільмы «Шлях да прычала», «Я крочу па Маскве», «Міміно», «Афоня», «Восеньскі марафон» і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Расіі.

Таксама ў гэты дзень экспедыцыяй савецкіх палярнікаў на ледакольным параходзе «Георгій Сядоў» былі адкрыты заходнія берагі Паўночнай Зямлі.

**Так гаварыў...**

**Фёдар ДАСТАЕЎСКІ:**
*«Кожны чалавек нясе адказнасць перад усімі людзьмі за ўсіх людзей і за ўсё».*

## УСМІХНЕМСЯ

**На прыёме ў паліклініцы:**
**— Доктар! Пашукайце ў мяне іншую хваробу. Гэтая занадта дарагая.**

Не будзь салодкі — інакш цябе з'ядуць. Не будзь горкі — інакш цябе выплюнуць.

**— Міша, ты спіш?**
**— Не-е...**

**— А чаму вочы заплюшчыў?**
**— Я зрок эканомлю...**

Глухі чуў, як нямы расказваў, што сляпы бачыў, як кульгавы хутка-хутка бег.

**Двое не вераць у тваю смерць: той, хто цябе любіць, і той, хто ненавідзіць.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2546.
Нумар падпісаны ў 19.30 24 жніўня 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12